Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

# НАША ПРАЎДА

...дзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска ... дастаўкай да хаты 1 зл. 50 ... ы ўдвая даражэй. Перамен... са 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 34 | Вільня, Субота 30-га ліпня 1927 г. | Год I



## Па-за жыцьцём,

Калі польскія ўлады кідалі вялізарныя сумы народных грошы на арганізацыю „асадніцтва“ на землях Заходняе Беларусі прэса польская, усіх бяз розьніцы кірункаў пяяла хвалебныя гімны асаднікам, ускладаючы на іх вялікія надзеі: асаднікі меліся несьці „сьвятло польскае культуры“ ў „цёмную“ беларускую вёску, ды гэтак умацоўваць польшчыну на „Крэсах“. Аднак, хутка выявілася, што пекныя словы аб „культуры“ й „цывілізацыі“, нібы-то пашыранай польскімі асаднікамі,—чыстая хлусьня: навет абшарніцкае „Słowo“ мусіла сцьвярдзіць, што асаднікі зусім і ня зьбіраліся займацца шырэньнем якой-колечы „культуры“, што гаспадараць яны на сваіх „дзялках“ нягодна, што тыя грошы, якія ўрад штогод кідае на „падкармліваньне“ асаднікаў, даслоўна праядаюцца (ці мо‘ й прапіваюцца...), а зямля, якой надзялілі асаднікаў, узяўшы яе з-пад носу ў беларускіх сялян, проста марнуецца, калі не аддаецца гэтым-жа малазямельным сялянам у арэнду на чыста ліхвярскіх варунках...

Гэтак можна сказаць, што з *гаспадарчага* пункту гледжаньня польскае асадніцтва на Беларускай зямлі збанкрутавала. А *культурна* асаднікі ў масе сваей аказаліся шмат ніжэйшымі за беларускіх сялян, якіх меліся „прасьвятляць“. І пад той час, як беларуская вёска ўсё ярчэй выяўляе сваё ўнутранае культурна-нацыянальнае жыцьцё, стараючыся сваімі сіламі здаволіваць свае культурныя патрэбы, якіх дзяржава здаволіваць ня хоча,— „культурнае“ жыцьцё асаднікаў прадстаўляе проста нейкае гніцьцё, расклад. Дык ня дзіва, што і дзеля *шырэньня польшчыны* на „Крэсах“ асаднікі аказаліся зусім няпрыгодным элемэнтам: вядучы жыцьцё кулакоў-дармаедаў, кормленых за зьбіраныя з працоўнага народу падаткі, польскія асаднікі прадстаўляюць і нацыянальна, і сацыяльна *чужую й варожую* для беларускіх масаў *сілу*, якой нашае сялянства яўна цураецца. Больш таго: асаднікі, якім вельмі падабаецца іх беспрацоўнае жыцьцё, зусім сьвядома стараюцца ламаць усякую беларускую культурна-грамадзкую працу і становяцца на падмогу паліцыі ў яе змаганьні з выяўленьнямі нацыянальнага і сацыяльнага руху сярод працоўных беларусаў.

Ясна, што польскія асаднікі мусілі пры такіх варунках астацца *вонках жыцьця беларускае вёскі.* Яны й жывуць супольным жыцьцём з тэй „навознай“ польшчынай, якую прадстаўляюць польскія паліцыянты, вучыцялі, рэстаранщчыкі і дробныя панкі—наагул, элемэнты непрацоўныя, а з беларусамі ня маюць нічога супольнага. Яркае выяўленьне гэтага бачым мы на самаўрадавых выбарах.

Усюды, дзе адбываліся выбары ў гмінныя рады, *беларускае сялянства муром адгарадзілася ад асаднікаў*. Аб тварэньні супольных з асаднікамі сьпіскаў нідзе й гутаркі ня было. Там, дзе асаднікі пападаюць у радныя, яны праходзяць выключна сваімі галасамі пры падтрыманьні іншых непрацоўных польскіх груп — паноў, ксяндзоў і г. п. І можна сьмела сказаць, што — ня будзь у нас сыстэмы *прапорцыянальнасьці* выбараў, пры якой і невялікія групы выбаршчыкаў могуць правясьці сваіх кандыдатаў—у лічбе, адпавядаючай лічэбнасьці гэных груп,—дык *ніводнага асадніка, як і ніводнага абшарніка, ня было-бы ў нашых гмінных радах.*

Такім парадкам яшчэ раз бачым, што польскае асадніцтва ёсьць у нас выключна тым, што і хацеў бачыць у ім тварэц ягоны—марш. Пілсудскі. Гэта— ня больш і ня менш, як *ваенна-паліцэйская рэзэрва*, як параскіданая па ўсім краю *ўзаружаная з‘арганізаваная сіла*— ў дапамогу польскай арміі і адміністрацыі на кожную патрэбу...

Так выглядае на дзеле „культурная місія“ польскага асадніцтва на землях Заходняе Беларусі. Так прадстаўляецца і роля асаднікаў у культурна-нацыянальным жыцьці і сацыяльным змаганьні беларускіх працоўных масаў. Беларускае сялянства вельмі добра разумее гэта, што й паказала так ярка на выбарах у гмінныя самаўрады.

## Ці-ж запраўды--канец райскага жыцьця на „лёгкім хлебе“ пэпэсаў.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

У старой царскай Расеі, як казаў паэт Некрасаў, было „беззаботнае ды вясёлае жыцьцё“ толькі — папу ды кату... Але, здаецца, у новай „дэмакратычнай“ Польшчы яшчэ ляпей, як ксяндзу ды кату разам, жылося дагэтуль — павадыром ППС...

Яны мелі сьпярша Начальнікам Дзяржавы свайго старога галоўнага павадыра. Дык яны мелі адразу — вялізарныя ўплывы на ўладу ў краі. Пасьля таго, як ён „адыйшоў ад улады“, паны пэпэсы аднак-жа здолелі неяк дапасоўвацца ды датарноўвацца— да кожнага істнаваўшага ў Польшчы ўраду (апрача, можа, толькі Вітасавага ўраду Хіена-Пяста). Кахаўся ды „лічыўся“ з імі — не як жыд, але як брат, Сікорскі, паважаў іх, „рахуючыся“ з імі не рахуючы скарбовых грошаў, урад Грабскага, з пашанай падкармліваў іх урад графа Скшыньскага...

Любілі ды шанавалі паноў пэпэасаў польскія абшарнікі — за тое, што гэтыя іх „сацыялістычныя сынкі“ адратавалі ім у найцяжэйшыя гады іх—урачыста дэкляраваныя працоўнаму хлебаробу двары. Цаніла пэпэсаў „на вагу золата“ ды шанавала, і польская буйная ды нябуйная буржуазія, якой „павадыры пралетарыяту“ спрытна ды сумленна памаглі дзяржаць на аброці работнікаў, ратуючы іх ад уплываў камунізму... Дый ведама і самі пэпэсы ўсьцяж хваліліся, што бяз іх дапамогі іх „таварышы ў мундзірах“ (як гучна называў усьцяж „Роботнік“ паноў паліцыянтаў) — нічога не зрабілі-б з узростам ды ўздымам радыкальнага работніцкага руху ў краі, у якім нездаволеньне працоўных масаў узьнімалася, як паводка на вясну...

Калі, карыстаючыся ў значнай меры гэтым нездаволеньнем народных масаў, душыць якое памаглі польскай буржуазіі і польскаму абшарніцтву паны пэпэсы, марш. Пілсудскі захапіў уладу ў краі, пэпэсы першыя сталі ізноў побач, кінуўшы ў часе барацьбы ўсе сілы сваей „работніцкай арміі“ — на бок вярнуўшагася — на чале адданага яму ў пераважаючай частцы войска — дыктатара.

Вось тут ужо паны пэпэсы — аж губы аблізвалі, думаючы аб тым, якое заправўды райскае жыцьцё — яшчэ лепшае, як да таго, — пачнецца для іх у Польшчы... Але іх былы галоўны павадыр, маючы пад сваей рукой армію жаўнераў, ня вельмі клапаціўся аб тым, каб прыхіліліць да сябе армію работнікаў з пэпэсаўскімі павадырамі...

Выбраўшы сабе найбольш адданых яму асабіста генаралаў з ППС, ды назначыўшы на добрыя міністэрскія ды іншыя пасады, марш. Пілсудскі пасьля рашуча — „адсунуў“ усіх іншых пэпэсаўскіх павадыроў ад сябе дый ад ураду, каб не перашкаджалі яму рабіць — у кумпаніі з заправўды вялікімі панамі — князямі ды графамі магнатамі абшарнікамі ды багатырамі—прамыслоўцамі — вялікую палітыку Вялікай Польшчы. У гэтую высокую кумпанію пэпэсаўскіх павадыроў ды павадырkoў, перапрашаем, — папросту ня пускалі... „за высоке прогі“, як казалі ў добрай старой шляхоцкай Польшчы, якая быццам пачала ўваскрашацца ў нашыя дні...

Пачаліся для пэпэсаў—замест яшчэ саладзейшых, як за Грабскага ды Скшыньскага, — зусім несалодкія дні... Урад іх былага галоўнага павадыра рабіў яўна ды адкрыта абшарніцкую дый буйна-буржуазную палітыку, усё больш хвалюючы гэтым ды абураючы абяздоленыя — на карысьць валадаючых клясаў — працоўныя масы места і вёскі... „Уплывы камунізму“, як толькі-што сцьвярдзілі самі пэпэсы, усьцяж узрасталі — у месьце ды на вёсцы. Пэпэсы-ж усьцяж павінны былі—усё больш ды больш „безынтэрэсоўна“ (цнота з канешнасьці, як кажуць немцы)... выпаўняць сваю ролю — барацьбітаў проці „ўплыву камунізму“, які ўсё шырэй ды глыбей захопліваў працоўныя масы...

Ясна, што побач з гэтай барацьбой—катастрафічна падалі самі ўплывы ППС сярод працоўных масаў места ды вёскі... Дык, калі раней—да павароту марш. Пілсудскага да ўлады—паны пэпэсы мелі прыяцелямі — і ўдзячнае ім абшарніцтва з буржуазіяй і паслушны ім у значнай частцы пралетарыят,робячы на гэтай двух-баковай прыязьні вельмі добрыя ды смачныя інтэрэсы, дык цяпер, калі да ўлады падыйшоў—пры іх дапамозе іх былы галоўны павадыр, пэпэсы пачалі траціць — і тое і другое: і карысную ды ганорную ўдзячнасьць усе магутнеючай польскай буржуазіі і ўплывы сярод работніцкіх масаў. Польская буржуазія з абшарніцтвам, знайшоўшы сабе лепшую, пэўнейшую апору ў войску марш. Пілсудскага, прагнала папросту вон пэпэсаў. Работніцкія масы, разгледзіўшыся дакладна ў шляхотнай—на абодва бакі—ролі сваіх „павадыроў“, пачалі шукаць сабе новых... Гэткім чынам, — у Партыі Работнікаў Польшчы не аказывалася—ні Польшчы (ўлады ў ей) ні работнікаў... Доўга цярпелі пакорна паны польскія сацыялісты гэткае палажэньне,—з аднаго боку трымаючы ўсьцяж сваіх партыйных міністраў ды віцэ-міністраў у габінэце Пілсудскага, з другога боку ўсьцяж пагражаючы яму—ўсе вастрэйшай апазыцыяй... Але ўрад—ня толькі не баяўся, але ўсе менш зьвяртаў на пэпэсаў увагі.

Тады—пад націскам работнікаў, пад пагрозай страціць сярод іх апошнія ўплывы — пэпэсы—пэўна-ж з боляй у сэрцы, з страхам перад „няведамай будучынай“—пастанавілі перайсьці ў заправўную апазыцыю... Сьпярша іх апазыцыя была... толькі проці паасобных міністраў абшарнікаў, якіх—побач з „дэлегатамі ППС“—пасадзіў у сябе ў габінэце марш. Пілсудскі.

Пасьля апазыцыя пашырылася—на ўвесь урад. ня кажучы толькі ані воднага слова аб тым, што гэта... ўрад Пілсудскага дый што ў склад ураду уваходзяць павадыры пэпэсаў... Наадварот: асоба марш. Пілсудскага зусім выключалася нейкім дзіўным разумаваньнем з адказнасьці ўсяго ўраду за абшарніцка-буржуазную палітыку яго, ня гледзячы на тое, што ўсім добра ведама было, а „кадэтам-пэпэсам—найляпей,—што за палітыку ўраду перадусім — паводле Канстытуцыі—адказывае палітычна яго галава...

Так справы ішлі да апошніх дзен, калі— чуючы ўжо блізкасьць „народнага суду“ — выбараў у парлямант — пэпэсы сабраліся з духам ды — ў сваей „чэснай ды паступовай апазыцыі“ — выдушылі з свайго горла ўжо зусім выразна нарэшце і—імя Старшыні ўраду маршала Пілсудскага... „Польская Сацыялістычная Партыя“—сваей апошняй адозвай „Да Працоўнага Народу ў Польшчы“ — аб‘яўляе быццам ужо паважна і шчыра (знак запыт.)—вайну свайму былому, але здрадзіўшаму цяпер, Галоўнаму Павадыру — Язэпу Пілсудскаму. Мы зусім ня хочам перацаніць ці перавялічыць значэньня гэтай адозвы пэпэсаўскіх круцялеў: круціліся ды круцілі на ўсе бакі—направа ды налева,—калі была магчымасьць гэтага, цяпер магчыма пакуль што для іх круціцца ды круціць — толькі налева... Але ўсё-ж трэба прызнаць, што для агульнай характэрыстыкі палітычнага палажэньня ўнутры Польшчы гэтая адозва дае шмат цікаўнага. Дык трэба з ей пазнаеміць нашых чытачоў.

### Адозва ППС — „Да працоўнага Народу Польшчы“.

Пачынаецца адозва так:

„Ад дзен маёвага перавароту прайшло 14 даўгіх месяцаў. Работніцкая маса адапхнута ад уплыву на дзяржаву. (А калі-ж гэта работніцкая кляса мела ў Польшчы гэты ўплыў? Паны пэпэсы мелі гэты „ўплыў“, але—якраз дзеля таго і дзя таго, каб яны трымалі чым далей работніцкую клясу ад прэтэнзіі мець уплыў на дзяржаву...). Паўната ўлады ляжыць цяпер у руках жменькі міністраў (сярод іх — 2 пэпэсаўцы дагэтуль ня выключаных з партыі...), вышэйшых вайсковых ды бюраўцаў (сярод якіх—шмат пэпэсаўскі іх „галоў“ ды „галовак“, як паны Васілеўскія, Голуўкі ды інш...).

Роля буйнага капіталу і абшарніцтва ўзрасла непамерна. Гаспадарчая палітыка ўраду пакорна слухае загадаў і жаданьняў гэтых валадаючых групаў. **Запраўдны кіраўнік Рэчыпаспалітай маршал Пілсудскі акружае ды хавае свае пляны ды намеры такой тайнай, што аб іх даведацца грамадзянству немагчыма зусім...** Мы ня ведаем, чаго ён хоча; ня ведаем, куды ён імкнецца (ці-ж заправўды — расьпісываюцца ў сваей дурноце, ці гэта — крывадушная гульня славамі.—Бо-ж — каму няясна, хто мае вочы на сучаснасьць, дый яшчэ крыху ведае гісторыі, — „куда ідзе“, дый—„чаго хоча“)... У бліжэйшым акружэньні марш. Пілсудскага растуць імкненьні „пронды“ (паў-фашыстаўскія) гэта „палова праўды“ — вельмі характэрна для пэпэсаў, якія бажыліся яшчэ паўгоду таму на заграмічных кангрэсах, што фашызму ў Польшчы няма ані на лякарства... Аднак-жа за паўгоду вырасла ўжо і—палова фашызму...

Узрастаюць пабліз марш. Пілсудскага рэакцыйныя настроі ды замыслы папросту — **варожыя народу...** (Гэта ўсё—толькі—у „акружэньні“ марш. Пілсудскага: дый слова акружэньне ўзята спрытна—у чужаслоў)...

Далей адозва кажа аб бяссільлі папіханага ўрадам Сойму, аб фактычнай безадказнасьці ўраду, аб страшэнна цяжкім палажэньні работніцкай клясы, аб усьцяж узрастаючай дарагоўлі, безрабоцьця, спадку заработнай платы, якія робяць працоўнае насяленьне места—жабракамі...

„Саюз ураду з абшарніцтвам спыніў зямельную рэформу; замест яе адбываецца бесплянова парцэляцыя, часта, калі не заўсёды,—коштам беззямельнага ды малазямельнага насяленьня краю“. Прэсавыя рэпрэсіі, самаволя адміністрацыі на „крэсах“, кумоўства з клерыкалізмам (з ксяндзоўскай камандай), усё гэта разам б‘е ў падставы **вольнасьць** у краі, без якой няма дэмакратыі...

Усё гэта змушае ППС (нарэшце—пасьля 14 месяцаў круцельства) — „зьвярнуцца з пратэстам ды заклікам да шырокіх работніцкіх масаў... беспасярэдна“.

Далей адозва вінаваціць урад, што ён перашкодзіў Сойму ў яго працы—над цэлым радам важных законаў, якія мелі на мэце палепшыць палажэньне працоўных масаў у Польшчы (а побач з тым—пагоршыць палажэньне меншасьцяў, пазбавіўшы іх яшчэ далей — правоў палітычных і грамадзкіх у Польшчы)...

„Таварышы Работнікі“, кажа адозва.

Вы былі магутным ядром, якое вяло барацьбу за незалежнасьць Польшчы. А сёньня ваша палітычная арганізацыя, ваша арганізацыя прафэсыянальная—адкінуты ўрадам, урадам, які паўстаў з перавароту, апырсканага вашай крывёй,—каб уладу захапілі цяпер тыя, хто калісьці падтрымліваў угоду з заборчымі царскімі манархіямі: — капіталіст, абшарнік і біскуп цягнуць руку цяпер, каб захапіць уладу ў Польшчы. (Яшчэ толькі цягнуць руку, а не зацісьнулі ўжо ўладу—у сваі бравіраваныя кулакі)..

„Дэмакратыя — у небясьпецы“. „Правы і здабычы сацыяльныя работнікаў—у небясьпецы“, крычыць адозва. — На Польшчу ідзе (яшчэ толькі ідзе)... **Дыктатура буржуазіі** — сьпярша гаспадарчая, а пасьля і палітычная...

Павадыры ППС, „беспасрэдна зьвяртаюцца“ цяпер да масаў работніцкіх, кажучы шчыра, што—**„ня шукаюць ужо больш помачы... сярод валадаючых клясаў“**...—як усьцяж шукалі дагэтуль—у сваіх уласных мэтах—коштам правоў ды інтарэсаў працоўных места і вёскі... Прынамсь хаця шчыра, можа, пакаяліся...

Цяпер пэпэсы клічуць работніцкія масы — да масавага руху. А калі-б заправўды ўзьняўся ў Польшчы масавы рух, дык пэпэсы першыя-б, як сацыял-дэмакраты ў Аўстрыі, перабеглі-б са страху ізноў на бок ураду буржуазіі...

„Будзьце гатовы да барацьбы“, клічуць работнікаў пэпэсы, страшучы марш. Пілсудскага...

Але, „боручыся“, ці вярней: заклінаючыся да — „падрыхтаваньня гатоўнасьці да барацьбы“, пэпэсаўская адозва, зразумела зараз жа перасьцерагае работнікаў, каб яны толькі—„ня слухалі камуністаў“. Бо-ж, кажа адозва,—„камуністычная дыктатура лягла-б на грудзі пралетарыяту каменем роўна цяжкім, як дыктатура фашыстаўская“...

Вось гэта дык — ясна: для польскіх са-

цыялістаў, якія ўсьцяж цытуюць Маркса дыктатура пралетарыяту ёсьць зусім роўная —па свайму зьместу ды „цяжару“—як і дыктатура фашызаванай буржуазіі, гэта значыць: буржуазіі, зламаўшай ды задушыўшай усялякія варожыя для яе клясавыя арганізацыі гэтага пралетарыяту, зламаўшай ды спыніўшай усялякія дэмакратычныя, праўныя дзяржаўныя перашкоды для свайго панаваньня ды вызыску працоўных у краі...

Так кажа ППС „беспасрэдна“ работнікам. Але, зьвяртаючыся да ўраду яшчэ толькі ўчора „Роботнік“ страшыў яго, што— калі прыдзецца ППС выбіраць між дыктатурай камунізму і дыктатурай фашызму, дык— „яшчэ пытаньне, якую выбярэ ППС“, гэта-ж значыла, што можа ППС выбярэ камуністаў.—Дык—каб урад ведаў аб гэтым...

Шкода бедных пэпэсаў...—Вечныя круцялі прызвычаіліся дый толькі і могуць жыць круцельствам... А цяпер, калі яны жорсткім ходам падзей пастаўлены ў неабходнасьць зрабіць урэшце той ці іншы выбар, дык вось і аказываецца, што яны і самі ня ведаюць, якая з насоўваючыхся дзьвух дыктурураў лепшая ці горшая: фашыстаўская ці камуністычная...

Урад іхняга былога павадыра аднак-жа, як сьцьвярджаюць яны самі, робіць усё, каб змусіць іх да выбару... З другога боку, зразумела, што для пралетарыяту — зусім ня ўсё-роўна, ці будзе яго ўлада ў краі, ці ўлада яго сьмяротнага ворага.

Вось тут і круціся. „Вот тут і жыві“, як казаў Купала...

25.VII. 1927. Я. К

## Што робіць польскі урад для сваіх абшарнічкаў.

Галоўная Управа Саюзу польскіх абшарнікаў,—пасьля апошняга зьезду дэлегатаў— выдала адозву да ўсіх польскіх абшарнікаў, каб хутчэй запісваліся ў склад сяброў Саюзу. Матывуючы карыснацьць Саюзу, адозва раскрыла дый падсумавала ўсё тое, што польскія абшарнікі здолелі здабыць ад свайго ўраду— за час ад апошняга зьезду дэлегатаў Саюзу. Дык вось, — за якія-небудзь 5—6 месяцаў абшарнікі выцягнулі ад ураду — на 24 мільёны пазыкаў па 4 працэнты ў год, з правам перапісаць доўг на далейшы тэрмін... Па 4 працэнты ў год—тады, калі ў Польшчы ня можна дастаць грошаў—па 4 прац. у месяц; тады, калі Польская Дзяржава сама пазычае грошы заграніцай—па 7—10 прац. у год. Апрача таго, урад даў значныя крэдыты на палепшаньне грунтаў, прычым абшарнікі дабіліся, што для 14 паветаў была ўрадам скасавана забарона выдаваць пазыкі на палепшаньне грунтаў „рольнічым“ супалкам несялянскім, дый яшчэ ўрад дакляраваў, што гэтую забарону скасуе і ў іншых паветах...

Гэта значыць, што раней пазыкі на палепшаньне гаспадаркі выдаваліся выключна сялянскім „кулкам рольнічым“, а цяпер абшарнікі вырвалі гэтыя крэдыты сабе—сваім „кулкам“, адабраўшы пазыкі гэтыя ад сялян... Гэткіх пазыкаў абшарнікі здабылі аж 8 мільёнаў—коштам сялянскіх гаспадарак... Далей, хваліцца абшарніцкая адозва, — на добрым шляху стаіць справа новай пазыкі для Саюзу—у суме 20—23 мільёнаў — праз „Рольнічы“ Каапэратыў. Умовы гэтай пазыкі маюць быць вельмі выгадныя. Фінансаваць гэтую пазыку маюць — Банк Краёвай Гаспадаркі (дзе камандзірам толькі-што назначаны ген. Гурэцкі...) і Польскі Банк... Апрача таго, яшчэ абшарнікі—з дапамогай мін. Скарбу—маюць выпусьціць праз свой Зямельны Банк на 30 гадоў 8-працэнтавыя „закладныя лісты“...

Гэткімі і падобнымі салодкімі рэчамі вабіць Саюз, каб усе абшарнікі, якія яшчэ чамусьці не запісаліся ў сябры Саюзу, чымхутчэй уваходзілі ў яго склад...

Цікаўныя рэчы... Мы толькі-што высьветлілі нашым чытачом, сколькі каштавала краю і дзяржаўнаму скарбу тая абшарніцкая палітыка ўраду марш. Пілсудскага, якая дазволіла ім вывезьці вялізарную колькасьць збожжа з краю. Абшарнікі зарабілі падвойна, ці патройна... А цяжар усіх гэтых карысьцяў абшарнікаў спаў на карк працоўных масаў. Дык цяпер уся здабытая ўрадам заграгічная пазыка, цалком пойдзе на падзяржаньне польскай валюты, якую падрэвае цяпер каштоўны ўвоз хлеба ў край — з замест вывезенага абшарнікамі ўвосені.. Але цяпер адозва абшарніцкага Саюзу хваліцца тым, што ўрад — ня толькі дазволіў абшарнікам вывозіць з краю збожжа, падбіваць угару цэны на хлеб, але і даў ім — вялізарныя крэдытовыя дапамогі, каб зрабіць магчымым для абшарнікаў дзяржаць чым даўжэй у сябе ў гумне ды ў сьвірні зярнё, чакаючы на далейшае падняцьце цэнаў на хлеб...

Дык — ці-ж з гэтага ня ясна, што ўрад, які „вядзе барацьбу проці дарагоўлі“, сам зьяўляецца супольнікам у праступнай акцыі абшарнікаў, падбіваючых цэны на хлеб, даючы ім магчымасьць дзяржаць чым даўжэй збожжа ў сябе, ня выкідаючы яго на рынак.

Ды пісалі, што гэткая абшарніцка ўрадавая „хітрая мэханіка“ робіцца ў Польшчы штогодна: рабіў яе Грабскі дый урэшце зламаў на ей — на карысьць толькі адніх абшарнікаў у Польшчы свой злоты; робіць тую „хітрую мэханіку“, дый яшчэ шырэй — урад марш. Пілсудскага, рызыкуючы таксама польскай валютай... І ўсё гэта — дзеля прыгожых вачоў польскага абшарніцтва.

А ці будзе гэтаму канец? Ці зразумеў польскі ўрад ды грамадзянства ў Польшчы ўсю небясьпеку дый усю несправядлівасьць гэткага кармленьня абшарнікаў — коштам рэшты насяленьня? Адказ на гэта ёсьць у тэй-жа адозве захопленых ўрадам абшарнікаў. Падыходзіць жніво, у бліжэйшыя дні зьявіцца на рынку новы хлеб. Але, якраз у гэты час дасьпее дакляраваная ўрадам пазыка п. п. абшарнікам — у 20— 23 мільёнаў злотых. Дык пэўна ж абшарнікі, маючы гэткі крэдытовы аванс сабе на жыцьцё, — пачакаюць ізноў выкідаць на рынак збожжа, дзержучы надалей недарэчна ды праступна— высокія цэны на хлеб...

Дык ясна, што абшарніцкая палітыка ўраду будзе ўсьцяж нязьменнай і ў гэтым годзе... Калі і хто палажа ўрэшце канец гэтаму паразытызму абшарнікаў на ўсім працоўным насяленьні Польшчы?.

„Запраўды-ж — калі хто мае багаслаўляць „маёвую рэвалюцыю“, дык пэўна-ж польскае абшарніцтва“, кажа ў „Роботніку“ п. Зарэмба, адзін з тых пэпэсаў, якія „ўсім сваім уплывам на работніцкую клясу“— падзяржалі пераварот, зроблены старым і галоўным павадыром ППС.

*Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрые разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.*

*БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.*

## Беларускае прадстаўніцтва у віленскім самаўрадзе.

*(Гутарка з радным Кузьмой Крукам).*

У сувязі з уваходам у склад віленскае мястовае рады грам. Крука, мы папрасілі нашага раднага падзяліцца з намі сваімі паглядамі на самы гэты факт і паінфармаваць аб праектазаным становішчы раднага Крука ў радзе. У адказ на рад пастаўленых намі пытаньняў радны Крук заявіў:

— Факт уваходу беларускага раднага ў віленскі самаўрад мае, на мой пагляд, проста гістарычнае значэньне. Пасьля векавога маўчаньня беларусы першы раз мецімуць магчымасьць публічна прамаўляць у мястовай радзе старадаўнае сталіцы нашага краю.

Доўгія гады беларусы ня мелі тутака голасу. Нашая інтэлігенцыя, нашыя заможныя клясы ўтрацілі сваю нацыянальнасьць і злучыліся з чужацкай буржуазіяй, а беларускімі—як і сягоньня — аставаліся толькі народныя нізы Вільні, пазбаўленыя ўсякага голасу ў справах свайго роднага места. І толькі цяпер, дзякуючы магутнаму ўздыму працоўных наагул, і беларусы здабылі для сябе магчымасьць падаць свой голас ў нашым мястовым самаўрадзе.

Лічу сваім абавязкам публічна сьцьвярдзіць, што палажэньне беларускае люднасьці Вільні, якая прадстаўляе найбяднейшую частку насяленьня места, зьяўляецца найбольш цяжкім. Буржуазная гаспадарка, не шкадуючы народных грошы на ўсякія культурныя навіны для паноў, ніякае ўвагі не зварачала й не зварачае на працоўныя масы і іхныя патрэбы наагул, а на патрэбы беларускае масы — тым балей: бо-ж „паны палажэньня“ зьяўляюцца для нас чужымі і сацыяльна і нацыянальна. Дзеля прыкладу адносінаў віленскага мястовага самаўраду да беларускае беднаты места падам факт, што ўся дапамога гэтай беднаце з боку места выражалася дагэтуль у асыгнаваньні па 20 злотых у месяц для шасьцёх бедных беларускіх дзяцей, дый тыя жабрацкія грошы магістрат цяпер спаганяе назад на тэй падставе, што гэная няшчасная дзетвара жыла ня ў прытулку, а пры сваіх галодных бацькох! Каб мець права на дапамогу, трэба ў нас назвацца перадусім палякомі!—Ня менш характэрныя адносіны віленскага буржуазнага мястовага самаўраду да беларускіх культурных установаў. Шэсьць гадоў назад мястовая рада зрабіла гістарычную пастанову: яна пастанавіла зьвярнуцца да польскае ўлады, дамагаючыся, каб беларускі музэй, беларуская гімназія і беларускі прытулак для бедных дзяцей, якія прытуліліся ў былых базыльянскіх мурох пры Вострабрамскай вуліцы, былі стуль выкінены на брук. Пры гэтым, каб знайсьці нейкае апраўданьне да акту гвалту над беларусамі, была прынята „на веру“ зласьлівая хлусьня раднага Студніцкага, які выдумаў і пусьціў у ход „рэвэляцыю“, быццам расейскі ўрад апаганіў у гэных мурох „цэлю Конрада“, перарабіўшы яе на клязэты, а беларусы, ведаючы аб гэтым ад яго, Студніцкага, сьвядома ўтрымліваюць „цэлю“ ў такім стане... І хаця пасьля скліканая ўрадам Сярэдняе Літвы камісія, зложаная з прадстаўнікоў польскага і беларускага грамадзянства, ды з учасьцем таго-ж Студніцкага, давяла, што мястовая рада ў сваей пастанове абаперлася на фальшывых падставах, бо ілжывасьць заяваў Студніцкага была вачавідная,—гаспадары места Вільні не анулявалі гэнае свае пастановы, і яна астаецца ў сіле й сягоньня, чорнай плямай ляжучы на польскай буржуазіі.

Адносіны пануючай у нашым месьце польскай буржуазіі да культурна-нацыянальных і гаспадарчых патрэбаў і пачынаньняў працоўных масаў—ня толькі беларускіх, але й усіх іншых нацыянальнасьцяў, — таксама ведамы добра. Вялізарныя грошы йдуць на здаваленьне патрэб заможных клясаў, на прыхарошаньне цэнтральных кварталаў, дзе жывуць багачы, на ўтрыманьне некалькіх польскіх тэтраў—коштам падаткаў, плочаных і няпольскім насяленьнем, на розныя ўрачыстыя „панскія“ абходы, на банкеты для важных гасьцей з заграніцы, якім дэманструецца „магутнасьць польскае культуры“ Вільні;—але заглянеце ў работніцкія кварталы, заглянеце ў цёмныя і сырыя лёхі ў панскіх палацах, дзе маюць жыльлё дазорцы дамоў, заглянеце на акраіны места, дзе жыве беднята, — і вы пераканаецеся, што ўся гэная слаўная „культура“ і яе дабрадзействы існуюць толькі для багатых. І пад той час, як віленскі самаўрад кідае шчодрай рукой сабраныя з сьлёзаў беднаты грошы на паказную веліч места,—тысячы безработных сямей ня могуць дабіцца працы і заробку, бо-ж на публічныя работы грошы ніколі не хапае! Не хапае грошы ў магістрату і на дамы для работнікаў, на падтрыманьне работніцкае каапэрацыі і т. п.

Беларусы, як працоўная бедната, адчуваюць на сабе „дабрадзействы“ буржуазнае гаспадаркі асабліва балюча. Беларусы разумеюць, што толькі перамога працоўных можа палажыць канец гэткай гаспадарцы і ўсім тым крыўдам, з якімі мы сяньня на кожным кроку сустракаемся. Вось чаму беларусы пайшлі на выбары супольным фронтам з аб'яднанымі работнікамі места бяз розьніцы нацыянальнасьці, ды галасавалі за „пятнастку“. І я, як прадстаўнік беларускага насяленьня места Вільні, заяўляю, што і ў Радзе буду дабівацца здаваленьня нашых нацыянальных і сацыяльных патрэбаў супольным фронтам з прадстаўнікамі працоўных другіх нацыянальнасьцяў. Аднолькавы нашыя крыўды й аднолькавыя дамаганьні. І хоць па сьпіску пятнасткі прайшлі ў Раду прадстаўнікі ня ўсіх нацыянальных работніцкіх групаў, кожная з іх знойдзе ў радных пятнасткі абарону сваіх патрэб і інтарэсаў, незалежна ад іх нацыянальнае прыналежнасьці.

Нельга спадзявацца нейкае паважнае зьмены гаспадаркі места пры новай радзе, у якой частку эндэкаў замяніла група прадстаўнікоў польскае згодніцкае партыі ППС. Сілы працоўных, якія ня йдуць на выслугу буржуазіі, яшчэ лішне тут слабыя, а ясна-ж, што толькі поўная перамога працоўных паложыць канец сучасным парадкам і ў нашым месьце і пакіруе мястовую гаспадарку на карысьць работніцкіх масаў усіх нацыянальнасьцяў. Як прадстаўнік аднэй з гэтых нацыянальнасьцяў, я і буду выкарыстываць сваё становішча раднага перадусім дзеля выяўленьня ўсіх крыўд і зьдзекаў, якія церпім мы, беларусы, дый усе іншыя працоўныя, дзеля галоснага публічнага пратэсту проці кожнага пагвалчэньня інтарэсаў мястовае беднаты, дзеля штодзеннае абароны яе ад вызыску й несправядлівасьці.

Радныя, якія прашлі з „пятнасткі“, намячаюць супольную лінію паступаньня ў Радзе — болей-меней у такім напрамку. Мы будзем салідарна дабівацца адчыненьня і ўтрыманьня на кошт места адпаведнай лічбы школ з роднай выкладовай мовай для ўсіх нацыянальнасьцяў — беларусаў, жыдоў, літвіноў і інш., будзем дабівацца крэдытаў на будову школьных гмахаў гэтых школаў і матэрыяльнага падтрыманьня для культур-

*Ул. Лідзн.*

# ДРУГ.

Рыгора Друга, гэтую аграмадную чалавечую глыбу, у адну ноч скрушыў тыфус. Ен ведаў жыцьцё, увесь яго поўнаважны хмель, усю залатую, любімую зямлю, па якой прайшоў ён тысячы вёрстаў, як ваяка і муж, і ён цяпер не пазнаваў неба над сьцепам, лёгкага, лілёвага неба, набухшага вясною.

Два раўнадушных валы, два сівыя машастовыя туры з дзеравяным бруском на аршыновых рагох ляніва вязьлі ў абозе яго сутулае цела, распасьцертае на карах і поўнае мутнае гарачае крыві, што ляжала на павеках густым бурштыновым туманам. Зялёныя шкляныя мухі садзіліся на твар Друга, веснавы залацісты туман ужо разгараўся над сьцепам і, кіргізы, прыхіліўшыся да лукі сядла і дзіка махаючы бізунамі, праносіліся на небасхіле.

Белыя сьцяповыя совы нявідна сядзелі на касьцякох, на пушовай конскай косьці, што застыла ў страшэнным усьмеху конскага суму. І запусьценьнем і земляною цішынёю спатыкалі адход аулы кіргізаў і белыя нямецкія сёлы з зялёнымі акяніцамі і залатакурчавай дачкою пастара, што стаяла на парозе кірхі. Калёністы моўчкі аддавалі жыўнасьць і скаціну і атрымлівалі ў замен квіткі, якія нічога ня варты былі. Яны панура стаялі ў аршыновых вайлаковых капялюшох пры сваіх белых хатах, яны ні слова не гаварылі, і толькі адстаўшага ездака Сьцяпана Ключарова ўтапілі яны ў ночы ў студні. Яны жыўцом утапілі яго, не забываючыся ні адное мукі, якія яны яму прыраклі, не прапусьціў-бы чалавек.

Туры, што вязьлі ў абозе кары, былі павольны, яны ведалі ход вякоў, і ім ня было куды сьпяшацца. На трэцьці дзень зрабіўся Друг страшным. Каралявая сыпка заліла яго агнём, квадратовы падбародак прарос барадою—сіваю і сіняю: два непражытыя дзесяцігодзьдзі асьвяцілі яго захад. Гэты раньні і горкі захад настаў дзеля Рыгора Друга, рукі яго белымі камамі ляжалі на грудзёх, цар тыфусаў удрызг разьбіваў яго, і сэрца, дазнаўшае шмат жарсьцяў, не хацела больш працаваць. Тады парашылі пакінуць Друга ў кіргіскім ауле, парашылі збавіць яго наастатак ад стэповага шляху і зялёных шкляных мухаў.

Кары з яго гарачым распасьцёртым целам паставілі ў халадку, на двары кіргіза, які йшоў пры абозе, кіргіз даручыў матцы, каб абмыла яна чалавека па абраду і ў сваю пару пахавала ў зямлі ў стэпу, галавою на ўсход. Матка стаяла на канцы сяла і праводзіла сына. Ей было сто гадоў, і была яна колерам чарней за земляныя кіргіскія дамы. Яе белыя валасы з-пад цюбіцейкі разьвяваў вецер, як куст татарніка, мутныя стэповыя вочы, абмытыя жыдкаю сьлязою, бязмысна, апатычна глядзелі ў троп. Яна праводзіла на сьмерць пятага сына, і пяты сын — быў апошні.

На шляху ляжалі саланчакі. Качкі ўжо прыляцелі на вясну на салёныя вазёры. Тысячавёрсьцем і пахамі першых траваў пахла сьцеп. Блакітныя хусткі воблакаў праплывалі пад ціхім небам; залаты стручок сонца цудам і мірам узьнікаў паміж іх.

Старая праводзіла сына і вярнулася на двор. Яна абцёрла рукавом сьмяротны пот з лобу Друга ў вяночках сьмерцядайнае сыпкі і акружыла яго ўзгалоўе сьвежымі стэпавымі зёлкамі. Потым яна падаіла маладую першажарэбаую кабылу, нацадзіла з чорных лайкавых мызкоў малака і дала чалавеку выпіць едкага цёплага напою. Чалавек выпіў малака, лінялае блакітнае неба нізка лягло яму на вочы, ён убачыў, наастатак, у гэтым нябесным тумане — кіргіскі двор, земляную паветку, белага сабаку, што ляжаў на пазалеташнім гнаі, і пустыя бязвочныя вочы старое, якія глядзелі на яго. Затым ён ізноў заплюшчыў вочы, і відзежы зьніклі.

Гэтак сон і маячаньне мярэжылі ў ім, і ціхая бязросная ноч з касьцяным месяцам, з сьпіртавымі пахамі зямлі, зьляцела на кіргіскі аул. Са сьцепу пацягнула прохаладзьдзю і ростам траваў, і старая прынесла чалавеку, які астаўся ей замест сына, кусок конскае скуры. На захадзе зарэзалі і зсьвежавалі каня, скурка была яшчэ поўнаю жыцьця сойчычкаў і жылак, якімі жыла, і старая палажыла гэты жывы і вільготны кусок на лоб Друга. Яна прыціснула рукою да яго лобу, сукравіца выступіла з-пад скуры, яна арасіла яго твар цярновымі каплямі, і кроў заліла яму вочы. І, праўдападобна, гэтая жывая конская скурка ўсімі рэшткамі нэрваў і жыцьця сабрала з яго галавы ўсю гарачку, яна прасьвятліла і палягчыла яе шчасным спакоем, і тады ў першы раз за восем дзён расплюшчыў ён зусім вочы і зразумеў, што гэта захадная лёгкасьць і, што бачыць ён сьвет у апошні раз. Убачыў ён гэты сьвет і ўздыхнуў; ён так уздыхнуў, што стогн уздрыгнуў яго самога, і сказаў, ня дзівячыся таму, як навошта ён тут:

— Цяпер мне канец, бабулька. Сядзь са мною, пасядзі побач душы.

Старая села ля яго, і гледзячы на лёгкі, плывучы ў малочнай плесьні месяц, Друг сказаў яшчэ:

— Вось яна—сьмерць, на краі сядзіць, а ня згоніш. А ёсьць ахвота яшчэ пажыць крышку, зямлю пaтаптаць.

Ен узяўся рукамі за край караў, прыпадняў было сябе, аглядзеў акрываўленымі вачыма ўвесь гэты летні мір, усю любімую гэтую начную сухаросную зямлю, і цяжкі клуб яго галавы стаў паволі хіліцца ўзад. Старая абцёрла шаршавым рукавом бруднае сукенкі пот з яго лобу, яна схілілася над ім і глядзела ў вочы сына, таму што сынам якойсьці маткі быў Рыгор Друг. Яна глядзела на яго родныя рысы і белыя сьлёзы, ня казячы твару, цяклі па межам яе шчокаў.

— Дыхай лёгка, у мяне дыхай, чалавек,—нарэшце сказала яна,—аддай мне хваробу. Шмат сыноў было, ні воднага не засталося. Каму патрэбна старая, а ты жыві, малады...

Сказала яна гэта і абняла за плечы. Яна прысмакталася да яго губаў сваім ротам і піла яго хваробу і душу, — і раптам стала гэтая сьцяповая ноч лажыцца на ногі Друга шчасьліваю прахалодаю. Нязвычайная лёгкасьць пранізала яго і белы, як паўхір, месяц, і пахі стараветных зёлак і тырсы плылі над ціхім яго захадам і над өтогадоваю маткаю, якая трымала за плечы шостага сына і ўсё не магла пусьціць яго.

Так пазнаў Друг апошнюю і нечаканую лёгкасьць, цудоўны мір і спакой наастатак зышлі на яго, і ўсьмешка пад кустамі вусаў прывітала рыб'ю лускаватую заранку.

Праз месяц па дарозе мы зайшлі да яго разьвітацца. Сьцяповыя дарогі ляглі з-заду нас тысячаю пройдзеных вёрстаў, і твары нашы па-будыйску абвугліла сонца. Кіргізы прывялі нас да незарослага пагорка, закіданага пыльнымі грудамі, зямля зсохлася і правалілася, жоўта рабыя жучкі-магільнікі капорсаліся на ёй. Наўкол гаравала і схілялася тырса. Кіргізы ў ватовых портках стаялі поруч з намі і глядзелі на чужую магілу. Гаручы дзень распасьцёрся над стэпам, над жабрачым аулам. Сьцяповы двохаршыновы сьцярвятнік нізка наўкол пайшоў над намі: як відаць, прыняў нас з вышыні за стада авечак.

Нам ня было чым адзначыць магілу Друга, і мы толькі прынесьлі цяжкі ружовы глыжак, што ляжаў у стэпу. Мы палажылі яго на магілу, абцерлі, і ён кунежліва заружавеў, як твар кабеты. Жанчына радзіла чалавека, жанчын любіў чалавек у нядоўгім сваім жыцьці, і кабета праводзіла яго ў апошнюю дарогу. Цяпер стала магіла прыхарошанай, яна засьвяцілася жаночым, стыдлівым полымем, і сьцяповыя краскі, якія накідалі мы на разьвітаньне, нарвалі дзеля нас смуглыя ручкі кіргізак, маленькіх борздавокіх дзяўчынак, будучых жанчынаў і маткаў.

Пераклаў М. Шыла.

на-асьсетных устаноў, бібліатэк, народных тэатраў кожнае з гэтых нацыянальнасьцяў—нараўне з польскімі. Будзем дабівацца, каб магістрат у-ва ўсіх сваіх публічных выступленьнях шанаваў мову ўсіх нацыянальнасьцяў места, друкуючы свае публікацыі — нобач з польскай — і ў мовах „меншасьцяў“, ды каб кожная з гэтых меншасьцяў магла свабодна й без перашкодаў прамаўляць у роднай мове ў Радзе і ў яе Камісіях. У гаспадарча сацыяльнай галіне мы будзем трэбаваць перадусім перакладу падаткавых цяжараў на заможныя клясы. Будзем трэбаваць забясьпечаньня права на працу для ўсіх работнікаў места бяз розьніцы нацыянальнасьці і веры, прыёму іх на службу ў мястовым самаўрадзе і на ладжаныя магістратам работы, бяз ніякіх аграніччэньняў для беларусаў, літвіноў і жыдоў. Будзем трэбаваць арганізацыі публічных работ, якія-б здаволілі патрэбы жыхарства найбяднейшых і найбольш пакрыўджаных кварталаў, ды адначасна далі працу й заробак тысячам безработных. Будзем трэбаваць скутачнае барацьбы з дарагоўляй. Будзем трэбаваць урэшце, каб мястовы самаўрад падтрымаў арганізацыю эканамічнае самапомачы работнікаў, таньныя работніцкія куткі і г. п., каб было распачата у шырокім маштабе будаваньне дамоў з таннымі кватэрамі для работнікаў, адпавядаючымі ўсім вымогам гыгіены.

Ведама, што зьдзейсьненьне ўсіх гэтых трэбаваньняў магчыма толькі шляхам упорлівага змаганьня працоўных усіх нацыянальнасьцяў з дыктатурай буржуазіі, толькі пры ўмове падтрыманьня ўсіх нашых выступленьняў у Мястовай Радзе арганізаванымі работніцкімі масамі — пад сьцягам работніцкае еднасьці.

Мы ня верым у добрую волю пануючае і ў новавыбарнай мястовай Радзе буржуазіі і не далі сваіх галасоў за ніводнага з кандыдатаў на прэзыдэнта места, якіх выстаўлялі розныя буржуазныя групы радных. І хаця сілы нашы былі лішне слабыя, каб думаць аб правядзеньні свайго кандыдата на прэзыдэнта, радныя з „пятнасткі“ — у знак свайго пратэсту проці засільля буржуазіі — выставілі самастойнага кандыдата работніцкага аб'яднаньня. А факт, што „пятнастка“ выставіла была маю кандыдатуру, зьяўляецца падвойнай дэманстрацыяй работнікаў места Вільні, згуртаваных каля партыяў „пятнасткі“: гэта — сьцьвярджэньне таго, што ў Вільні найбольш пакрыўджаныя беларуская працоўныя масы маюць роўнае з другімі нацыянальнасьцямі права на кіраваньне справамі сталічнага места Краю.

адбыцца ў Варшаве нейкі „міжнародны зьезд“...

### Звальненьне рэдактара часопісі „Націо“.

Арыштаваны разам з рознымі „камуністамі“ ў Варшаве п. Арыо, рэдактар часопісі „Націо“ (орган буржуазнага блёку нацыянальных меншасьцяў) выпушчаны на волю. Паліцыя заяўляе, што зрабіла памылку: ніякай сувязі з камуністамі п. Арыо ня меў.

### Ізноў—перарыў ў польска-нямецкіх гаспадарчых перагаворах.

Нямецкі пасол у Варшаве п. Раўшэр выехаў на месяц у водпуск. Нямецкае афіцыяльнае агенства, паведамляючы аб гэтым, дадае, што далейшыя перагаворы ў справе заключэньня таргоавага дагавдру, узнавяцца—пасьля павароту пасла ў Варшаву... Гэтыя перагаворы, як ведама, ідуць ужо некалькі гадоў—пасьля таго, як Грабскі „сьмела“ пайшоў на рызыку гаспадарчай вайны з Нямеччынай, падрэзаўшы ў значнай меры якраз гэтым—польскую валюту...

### Непамысны для Польшчы прысуд Міжнароднага Трыбуналу ў Гаазе — у справе хімічнай фабрыкі ў Хожове.

Польшча, дастаўшы з рук саюзьнікаў, пабіўшых Нямеччыну, задарма вялізарныя багацьці, створаныя працай і культурай немцаў, ня кажучы ўжо аб шматох паўнямецкай, а часам і чыста нямецкай тэрыторыі, захапіўшы ўсё гэта, пачала прысвойваць сабе і шмат прыватнай уласнасьці нямецкіх грамадзян на атрыманай тэрыторыі. Саюзьнікі глядзелі на гэта скрозь пальцы — бо ім перадусім ішло сьпярша аб чым большае аслабленьне ды зруйнаваньне нямецкай гаспадарчай сілы ў сьвеце... Але пасьля, калі Нямеччына аказалася непераможнай гаспадарча дый саюзьнікі зразумелі сувязь ды залежнасьць свайго гаспадарчага разьвіцьця ад Нямеччыны, палажэньне зьмянілася. Нямеччына пачала бараніць свае правы ў розных міжнародных установах — палітычных і судовых — і выграваць справы. Так было з цэлым радам справаў у Лізе Народаў, так было і ў Вышэйшым Трыбунале ў Гаазе.

Справа, якую толькі што вырашыў не на карысьць Польшчы гэты Трыбунал, доўга цягнулася. Спор ішоў аб слаўную хімічную фабрыку азотных соляў, выробляных з паветра, якую выбудавалі немцы. Цяпер гэта фабрыка дае Польшчы вялізарныя карысьці, выраблаючы патрэбныя азотныя солі — як для хімічных удабрэньняў таксама і для выбуховых матэрыялаў. Гэта фабрыка каштуе некалькі дзесяткаў мільёнаў залатых марак, але польскі ўрад ня хоча плаціць іх нямецкім уласьнікам фабрыкі, — „адабранай у казну“... Немцы пажаліліся ў Гаагу, польскі ўрад заявіў, што Гаагскі Трыбунал ня мае права вырашаць гэткія справы. Справа цягнулася доўга, але, як ні круціў польскі ўрад, Трыбунал прызнаў сябе ўладным вырашыць гэты спор, і польскаму ўраду прыдзецца заплаціць за фабрыку...

## Уперад, браце!

Сіня, сіня даль бясконца,
А ў той далі—мэта, сонца...
Хвалі ветрыка
У паветры
Прабягаюць,
Срэбрам зьзяюць
Ніўкі збожжа.
Як прыгожа...
Гэй, наперад, браце-дружа!
Што, зьнядужыў?—не жартуй-жа!
Хопіць сілы,
Глянь як міла
Навакола —
Выйдзем здолу,
Торбы скінем,
Адпачынем.
Хоць крамністы шлях дарогі
Пярuністы—млеюць ногі...
Дух бадзёрны,
Непакорны,
Імпат волі
На прывольле
З грудзей рвецца,
Удаль імкнецца.
Сіня, сіня даль, як мора,
Ужо сягоньня, то ня ўчора...
Гэй сябіты,
Барацьбіты,
Сьпее ніва,
Будзе жніва
З нашай працы...
Уперад браце!..

**Міхась Васілёк.**

# Палітычная хроніка.

## У Польшчы.

### Паседжаньне Рады Міністраў.

На апошнім паседжаньні Рады Міністраў паміж іншым прыняты праект дэкрэту — аб „прымусовым высяленьні насяленьня і вывазу яго маемасьці з тэрыторыі, якая знаходзіцца пад пагрозай“... Вестка кажа досьць глуха, але мы помнім, што гэткага зьместу быў калісьці—гады 2—3 назад—апрацаваны законапраект, які меў на мэце даць права дзяржаўнай уладзе вывозіць—у часе вайны ці на выпадак яе пагрозы — мясцовае насяленьне з яго маемасьцю з тэрыторыяў, якім пагражае заняцьце няпрыяцелем. Мы памятаем, як проці гэтага праекту абурыліся тады — ня толькі тэрытарыяльныя меншасьці, якіх галоўным чынам і ў першую чаргу датычыў праект, але навет і польская лявіца Сойму... Ясна, якія страшэнныя шкоды для нашага, украінскага ці нямецкага насяленьня абодвух „крэсаў“—усходніх і заходніх мог нарабіць залішне нэрвовы ўрад, які-б атрымаў права—пры аднэй толькі навет „пагрозе небясьпекі“ высяляць мясцовае насяленьне з яго маемасьцю з яго адвечных сядзібаў, — як гэта рабіў у часе вайны расейскі ўрад... Мы помнім, як палякі першыя страшэнна пратэставалі проці гэткай тактыкі расейскага ваеннага камандаваньня...

Тады—2—3 гады назад,— калі законам мог стаць толькі праект, які прайшоў праз парлямант, урад, даведаўшыся аб прынцыповай варожасьці да свайго праекту Сойму, пахаваў свой праект. Але, як відаць, пахаваў—да часу... Да часу, калі ўрад здабыў сабе для сваіх праектаў—больш „кароткі ды лёгкі“ спосаб „рабіць іх законамі“...

Пачакаем, паглядзім, што гэта за дэкрэт дакладна...

Далей, у ліку іншых справаў, Рада Міністраў асігнавала — на адбудову зруйнаваных ураганам 12 — 15 чэрвеня будынкаў у Наваградчыне—750 тыс. злотых — як пазыку на доўгі тэрмін і на нізкі процант.

### Недарэчны ды незаконны загад мініст. вайсковых спраў.

Міністэрства вайсковых спраў выдала загад, які „нармуе“ справы ўхіленьня польскіх грамадзян ад службы ў войску. Згодна гэтага „загаду“ вайсковыя ўлады маюць рабіць сьпіскі асобаў, якія ўхіляюцца ад ваеннай службы ды прадстаўляць гэтыя сьпіскі старостам. І вось быццам—так пішуць газэты—унясеньне ў гэтыя сьпіскі „аўтаматычна“ будзе цягнуць за сабой — пазбаўленьне такога грамадзяніна, які ўхіляецца ад ваеннай службы — правоў польскага абыватэльства...

Калі праўда ўсё гэта, дык — папросту дзівіцца трэба „юрыдычнай сьведамасьці“ міністэрства вайсковых спраў. Ня кажучы ўжо аб тым, што ў гэтых „аўтаматычных сьпісках“ ухіляльнікаў могуць быць усялякія абмылкі, часам навет злосныя. Але перадусім—ніякага „аўтаматызму“, ці прасьцей—самаволі вайсковай ці цывільнай адміністрацыі — ня можа быць у так важнай справе, як—устанаўленьне факту ўхіленьня і—назначэньне за гэтую віну—аднэй з найцяжэйшай кары, якую ведае карны закон—пазбаўленьне правоў грамадзянства, ці інакш кажучы — выгнаньня з бацькаўшчыны. Як устанаўленьне віны, таксама і меру кары за яе можа рабіць толькі суд, але не паны — „воінскія начальнікі“ ды старосты... Напомнім хаця-б, што — усюды на сьвеце прызнаецца права ўхіленьня ад вайсковай службы — па рэлігійным пераконаньням.

Што-ж да „пазбаўленьня правоў грамадзянства“, дык і тут у паноў ваеннага ці цывільнага начальства таксама—кароткія рукі: у Польскай Канстытуцыі—арт. 88 — ясна сказана, што „пастанаўленьні аб польскім грамадзянстве, аб яго набыцьці ці ўтраце,—маюць азначыць спэцыяльныя законы“.

Гэта-ж значыць, што — сьпярша міністэрству вайсковых спраў трэба ўнясьці ў парлямант суадказны законапраект, правясьці яго праз Сойм і Сэнат, а пасьля толькі—рабіць „загады“ на падставе істнуючага закону. Інакш гэтыя „загады“—толькі ўсяго—незаконныя...

### Ізноў — вялізарныя мытныя надужыцьці ў Польшчы.

Польская буржуазія ды абшарніцтва заўсёды пачувалі сябе „прыроджанымі гаспадарамі краю“, дый на дзяржаву глядзела, як і ўсюды, як на паслушную прыладу для забясьпечаньня яе, буржуазіі, правоў і інтарэсаў.

Дзеля таго, напрыклад,—абшарнікі папросту адмаўляліся плаціць падаткі, пагражаючы... аддаць свае двары ўраду (толькі-б — не працоўнаму хлебаробу...), а польская мястовая буржуазія, якой цяжэй ісьці за „гераічным“ прыкладам абшарнікаў, заўсёды старалася неяк выкруціцца ад падаткаў, скруціць на сплаце іх, ашукаць скарб, ня спыняючыся, у паасобных выпадках,—перад праступным нарушэньнем закону... — Аб гамерычных надужыцьцях гандляроў, прамыслоўцаў адносна да скарбу—усьцяж кажуць газэты ў апошнія гады. А сколькі справаў пахавана, сколькі асталося нераскрытымі... Вось, толькі што ў Варшаве раскрыліся яшчэ вялізарныя мытныя ашуканствы нейкай фірмы „Космос“, якая, маючы ад ураду чамусьці асаблівыя палёгкі ў мытных аплатах, увозіла з заграніцы шмат чаго — ня толькі для сябе, але—за плату ў сваю кішаню—і для другіх фірмаў, якія гэткіх палёгкаў ад ураду не здабылі... Дзяржаўны скарб, як аблічае пракуратура, пацярпеў стратаў—на некалькі мільёнаў злотых...

### Марш. Пілсудскі едзе ў Вільню.

Марш. Пілсудскі, як паведамляюць з Варшавы, выехаў у Вільню, дзе прабудзе некалькі дзён —у справах сямейных.

### Як падзяліла „свая рука“ пазыку Дзяржаўнага Банку на адбудову.

Мы падалі вестку аб тым, што Дзяржаўны Зямельны Банк даў дробным зямляўласьнікам Наваградчыны пазыку ў 750 тыс. зл.—на адбудову пасьля шалеўшага па яе прасторы ўрагану. Так пісалі мясцовыя газэты. Цяпер газэты падалі больш дакладныя весткі аб гэтай пазыцы. Дзярж. Рольны Банк асігнаваў усяго на крэдытовую дапамогу ахвярам гэтага ўрагану аж — 8 мільён. 700 тыс. злот. Дык вось цікаўна, як падзяліла „свая рука—уладыка“ ў Варшаве гэтую значную суму паміж рознымі часткамі Польшчы, па якім прайшоў гэты ўраган.

На ваяводзтвы цэнтральныя, гэта значыць—чыста польскія свая рука дала 2 міл. 825 тыс. злот.; на ваяводзтвы „малапольскія“, гэта значыць — на чыста польскую Кракоўшчыну і Усходн. Галічыну, дзе значная частка палякоў,—2 міл. 420 тыс.; на ваяв. заходнія, ці ў Пазнані ды Паморры, дзе ёсьць значная дамешка немцаў, — 1 міл. 660 тыс. зл.; урэшце—на ваяводзтвы ўсходнія наагул, гэта—ня значыць, што — на адну Наваградчыну, але—на ўсю Заходнюю Беларусь і Валыншчыну, гэтая варшаўская рука кінула—795.000 зл. А калі так груба параўнаваўшы абшары гэтых усходніх ваяводзтваў з рэштай Польшчы, дык выйдуць—акурат — роўныя паловы...

### Звальненьне ў Галоўнай Камандзе Дзяржаўнай Паліцыі.

У Галоўнай Камандзе Дзяржаўнай Паліцыі зроблена, здаецца, грунтоўная чыстка: чатыры з вышэйшых яе ўрадоўцаў, паміж іншымі—добра ведамы беларусам—„спэцыяліст па беларускіх справах“ падінспэктар Снарскі,—звольнены ў адстаўку.

Як ведама, вышэйшыя становішчы ў дзяржаўнай паліцыі ў Польшчы былі — ад часу, калі Пястоўцы зьмянілі сваю палітычную ролю ў Польшчы на паліцэйскую службу ў Хіене, захоплены пястоўцамі. Дык, відаць, ад гэтых усіх элемэнтаў пакрыху звальняюць дзяржаўную паліцыю сучасныя паны палажэньня, усьцяж праводзячы паступовую яе—мілітарызацыю...

### Да арыштаў „камуністаў“ у Варшаве.

Правая прэса даносіць, быццам сярод арыштаваных у Варшаве камуністаў, апроч украінцаў, ёсьць і некалькі прыехаўшых з Нямеччыны ды з Чэхіі і інш. — Быццам меў

### Спатканьне пасла Патка з Чычэрыным.

Пасьля павароту ў Маскву польскі пасол Патэк быў прыняты Чычэрыным, з якім меў доўгую гутарку. Польскія газэты пішуць, быццам гэта гутарка мела вельмі супакойваючы ўплыў на публічную апінію ў ССРР, якая была так абурана забойствам радавага пасла ў Варшаве.

## Заграніцай.

### Паседжаньні аўстрыйскага парляманту.

Першае паседжаньне аўстрыйскага парляманту, якім так пагражалі ўраду сацыялдэмакраты, адбылося—ціхусенька. Парлямант толькі пастанавіў — выразіць жаль з прычыны здарэньняў і спачуцьцё ахвярам выпадкаў. Паседжаньне было кароткае і на гэтым скончылася.

Але на наступным паседжаньні сацыялдэмакраты дэклярують — вось калі ўжо дык разьвярнуць страшэнную атаку проці ўраду. Пачакаем справаздачы.

### „Бурнае паседжаньне“ аўстрыяцкага парляманту.

Адбытае ўжо — другое з чаргі — паседжаньне парляманту ў Вене, якое мела быць — страшэнна бурным — бо сацыял-дэмакраты мелі на ім даць „рашучы бой буржуазнаму ўраду“, аказалася — такім-жа ласкавым ды пагодным, як першае...

Першым выступіў прадстаўнік ўрадавай партыі — „хрысьціянскі сацыяліст“ пас. Гіртлер, які выразіў пагляд на выпадкі краёвага сялянства. Пасьля яго выступіў сацыялдэмакрат, пас. Рэнер. Паўнюткі Сойм спадзяваўся гразы, буры, грымотаў ды маланкаў сацыялістычнага Юпітэра... Але пасол Рэнэр ветліва падзякаваў папярэдняму аратару за яго ўмераны тон дый сказаў таксама—вельмі ўмераную прамову...

Трэцім выступіў прадстаўнік „сялянскай партыі“, які — дамагаўся для рэвалюцыянэраў — „адбудовы“ кары сьмерці, якая была скасавана ў Рэспубліцы... Ясна зусім, што сацыялісты —панамі палажэньня ў Аўстрыі, як цьвердзяць усьцяж іхнія газэты...

### Арыштаваньні ў Вене ідуць усьцяж.

Арыштаваньні ў Вене пераважна сярод работнікаў ідуць усьцяж. Газэты пішуць, быццам да 3.000 папярэдне арыштаваных у апошнія дні яшчэ далучыліся—аж 300.

Адна з беспартыйных незалежных паступовых газэтаў у Вене радзіць прэзыдэнту Аўстрыяцкай Рэспублікі—на падставе свайго канстытуцыйнага права — абвясьціць адразу амністыю ўсім арыштаваным, — бо калі цягнуць праз паліцыю ды суд усе гэтыя справы, дык толькі глыбей будзе выходзіць напаверх сацыяльная ненавісьць у краі, распаляцца палітычныя страсьці. Трэба—забыцца аб страшэнных падзеях, у якіх павінны ўсе і ніхто.

Але, з другога боку, пануючыя буржуазныя групы падымаюць па ўсяму краю, асабліва ў правінцыі, дзе сільныя іх уплывы сярод цёмнага сялянства,—ненавісьць да мескіх работнікаў. Дык адсюль з правінцыі ідуць дамаганьні—поўнага разгрому ўсіх работніцкіх арганізацыяў. Некалькі разоў ужо выбухалі на мясцох, у глухіх кутох краю — масавыя напады арганізаваных бандаў „сялян“ на работнікаў і разгромы іх арганізацыяў. І цёмныя сяляне ідуць на бой з работнікамі, з якімі іх лучыць добра зразумлены інтарэс, ідуць біць іх — на карысьць едучай на карку абедзьвюх працоўных клясаў буржуазіі.

### „Экс-кароль“ румынскі Кароль вядзе нарады.

Парыжскія газэты паведамляюць, што ў адстаўнога румынскага наступніка трону адбыліся нарады яго прыхільнікаў. Гэтыя прыхільнікі зрабілі прынцу Каролю публічную авацыю на вуліцы, вітаючы яго, як караля Румыніі.

### Румынская сялянская партыя — проці Рэгенцыйнай Рады.

Супакойваючыя весткі, які пашырае румынскі ўрад аб палажэньні ў краі пасьля сьмерці караля, ня зусім пацьвярджаюцца. Афіцыяльна падаваліся весткі, быццам апазыцыя — сялянская і кансэрватыўная — выразілі вернасьць Рэгенцыйнай Радзе, якая мае заступаць 6-ці летняга караля — аж у працягу 15 гадоў яго малалецтва. Але вось сама Сялянская Партыя выдала адозву, у якой — не прызнае Рэгенцыйную Раду ня толькі мэтнай, але і проста законнай... Дык папросту — не прызнае зусім...

### Ваеннае палажэньне ў Румыніі.

А вось, заграічныя газэты пішуць, што ў Румыніі — абвешчаны ваенны стан, што ў сталіцы яе — усе ўрадавыя ўстановы ахоўваюццца вайскамі, што ў краі пануюць страшэнная цэнзура ды рэпрэсіі, што апазіцыя не прызнае Рады, ды трэбуе перагляду справы аб наступніцтве трону, што сялянская нацыянальная партыя патрэбавала перадусім—выхаду з Рэгенцыйнай Рады патрыярха, як галавы царквы, якая не павінна ўмешывацца ў палітыку.

### Ізноў — „рэвалюцыя“ ў Партугаліі.

Як пішуць з Парыжу, у Партугаліі ізноў выбухла „рэвалюцыя“. Далейшых вестак пакуль-што няма. Але — што палажэньне паважнае, відаць хаця-б з таго, што старшыня ўраду Кармона тэлеграфаваў гішпанскаму свайму калегу, што — „партугальскі ўрад — гаспадар палажэньня... у Лісабоне (сталіца Партугаліі). Калі ўрад — пан толькі ў сталіцы, дык справа — дрэнная.

### Чэмбэрлен выбраны павадыром англійскіх кансэрватараў.

Чэмбэрлен выбраны зьездам—павадыром кансэрватыўнай партыі. Гэта значыць, што ён мае быць і прэм'ерам кансэрватыўнага ўраду. Такі звычай парлямэнтарны ў Англіі. І вось, ужо Балдвін паехаў у водпуск, а Чэмбэрлен пакуль-што назначаны заступнікам прэм'ера. Як ведама, дагэтуль заступнікам прэм'ера—канкурэнтам Чэмбэрлена быў Чэрчыль, які—яшчэ значна „чарнейшы“ рэакцыянер як Чэмбэрлен.

### Англійскі адказ нямецкім нацыяналістам.

Павадыр нямецкіх нацыяналістаў граф Вэстарп зьмясьціў у адным рэакцыйным англійскім журнале артыкул, у якім зьвярнуўся да англійскага ўраду з прапазіцыяй такога зьместу. Англійскі ўрад дапаможа Нямеччыне дабіцца перагляду пляну Доўса (трактат падпісаны Нямеччынай у справе ад-

шкадаваньня за ваенныя страты саюзьнікаў) і перагляду ўсходніх граніцаў Нямеччыны; за гэта Нямеччына (дакляруе за яе павадыр нямецкіх нацыяналістаў), дапаможа Англіі ў яе барацьбе проці бальшавікоў.

Тая-ж англійская часопісь, адказываючы на прапазіцыю графа Вэстарпа, называе яе перадусім „немаральнай“. Бо-ж аўтар заклікае Англію, каб яна зламала падпісаны ёй Вэрсальскі Трактат, з свайго боку дакляруючы, што Нямеччына зробіць тое-ж самае, з Рапальскім трактатам (трактатам з Радамі). Калі-ж Нямеччына запраўды хоча „паправіць“ адносіны на ўсходзе Эўропы, кажа часопісь, дык хай шчыра паразумеецца... з Польшчай.

Добры адказ, няма што казаць,—добрая навука шпаркаму не па розуму нямецкаму фашысту.

### „Камуністычныя“ паўстаньні ў Сінгапуры, на Філіпінах ды інш.

У шмат месцах, на астравох Ціхага акіяну, належачых да Амэрыкі, Англіі, Галяндыі ды Японіі, усьцяж выбухаюць паўстаньні сярод мясцовага насяленьня. Ведама-ж, каб лягчэй распраўляцца з гэтымі паўстаньнямі, лягчэй гвалціць правы грамадзян ды закон, а да таго—мець яшчэ „апраўданьне“ перад заграгічнай апініяй, — усе гэтыя паўстаньні, выкліканыя, ведама-ж, перадусім гвалтамі ды надужыцьцямі каляніяльнай („крэсовай“) адміністрацыяй, — абвяшчаюцца згары—„камуністычнымі“, выкліканымі „маскоўскімі агентамі“ — дый душацца крывавым тэрорам.

### Антыяпонскі рух у Кітаі павялічваецца.

Японская газэта „Майніцы“, якая выходзіць у Шанхаі, падкрэсьлівае, што антыяпонскі рух прымае награжаючыя разьмеры.

### Гандляры нездаволены.

Апошнія меры Нанкінскага ўраду ў галіне падатковай палітыкі: забараненьне вывазу з Шанхаю серабра і распаўсюджаньне аблігацый 60 мільённага займу, выпушчанага на забясьпечаньне салёнай манаполіі, выклікала крайняе абурэньне ў гандлёвых колах.

### Скарачаюцца.

З прычыны антыяпонскага руху ў Шанхаі, японскія фабрыканты думаюць скараціць работы на належачых ім фабрыках.

У першую чаргу адмяняюць начную работу, потым маюць на мэце скараціць рабочы час.

### Амэрыканскія студэнты ў СССР.

У Ніжні-Ноўгарад і Івана-Вазьнясенск прыбылі амэрыканскія групы студэнтаў. У Ніжнім амэрыканцы аглядаюць Сормаўскі завод.

### Прамова Варашылова.

У апошняй сваей прамове пад Ленінградам 25-га ліпня камісар ваенных спраў Варашылаў заявіў паміж іншым, што Эўропа цяпер знаходзіцца прыблізна ў такім самым палажэньні, як перад вайной. Шмат азнакаў кажа аб тым, што вайну гэтую ўдасцца абмінуць. Але вось, у апошнія часы палажэньне так пагоршылася, што ўжо пэўнасьці гэтага няма. Проці СССР зьбіраюцца хмары, проці работнікаў завастраюцца на ўсім сьвеце рэпрэсіі. Дык можна хутчэй спадзявацца выбуху. Мы павінны лічыцца з тым, што перад намі будзе вельмі сільны вораг. Але з гэтага выходзіць толькі тое, што мы павінны — добра падрыхтавацца да вайны. Перамога-ж будзе напэўна нашая. Зз нас, апрача нашай арміі, якая мае, напрыклад, паветраны флёт—нягоршы, як любая з найвялікшых дзяржаваў, стаіць уся сусьветная армія міжнароднага пралетарыяту.

### Магчымасьць аб'яднаньня сацыялістаў з камуністамі — у прафэсыянальных работніцкіх арганізацыях.

26-га ліпня пачаліся працы арганізацыйнага Камітэту — дзеля скліканьня міжнароднага зьезду прафэсыянальных саюзаў, які мае адбыцца ў жніўні. На паседжаньні Камітэту будзе разглядацца пытаньне — аб магчымасьці стварэньня супольнага фронту між прафэсыянальнымі саюзамі — сацыялістычнымі і камуністычнымі.

Гэта пытаньне выклікае вялізарнае зацікаўленьне — ня толькі сярод работнікаў, але і сярод — буржуазіі, якая-ж пэўна найбольш зацікаўлена ў тым, каб — раскалоць адзіны работніцкі фронт, скіраваны проці яе панаваньня ў сьвеце.

## Студэнцтва у кітайскай рэвалюцыі.

(*З Ліста*).

Таксама, як і ў расейскай рэвалюцыі 1905 году, як і ў-ва ўсёй гісторыі рэвалюцыйнага руху, галоўным чынам у пэрыяды заціпша ў рабочых арганізацыях — у Кітаі студэнцтва мае і мела вялікую ролю ў рэвалюцыі. Гаворачы аб Кітайскім студэнцтве, мы павінны казаць ня толькі аб студэнтах вышэйшай школы. Такім чынам сучаснае кітайскае студэнцтва налічвае ў сваіх шэрагах армію ў 5-6 мільёнаў моладзі, у большай частцы вышадшай з колаў дробнай буржуазіі або сялянства. Гэта моладзь і яе настрой добра характарызуюць супроць — мілітарыстычныя і рэвалюцыйныя тэндэнцыі кітайск. народу.

Найбольш важная роля студэнцтва была ў пачатку рэвалюцыі. Тады масы студэнтаў пасылалі ў гарады і вёскі сваіх агітатараў для залічэньня ў шэрагі рэвалюцыі мас дробнай буржуазіі, саматужнікаў і гандляроў. Шчыра прымаючы ўдзел у барацьбе за вызваленьне кітайскага народу, студэнцтва ў той-жа час дапамагала рабочым у барацьбе супроць цяжару кітайскага мілітарызму, які падтрымліваецца чужаземнымі сіламі.

У Шанхайскіх здарэньнях і пасьля іх студэнцтва ўсялякім чынам паддзержвала рабочых, ці зьбіраючы грошы для дапамогі бастуючым, ці арганізуючы дэманстрацыі і сходы пратэсту супроць зачыненьня рабочых арганізацыяў, па загаду вайсковай улады. У шмат якіх вялікіх гарадох (Шанхаі, Пэкіне, Ханькоў, Учан і г. д.) былі даволі значныя дэманстрацыі студэнтаў, якія пратэставалі супроць разьні рабочых у Шанхаі.

На гэты рэвалюцыйны акт кітайскія мілітарыстыя адказалі многімі лютасьцямі: у Пэкіне, Шанхаі, Цян-Цзіне і І'чане былі заарыштаваны і зьбіты сотні і тысячы студэнтаў; многія з іх былі забіты.

У паўночным Кітаі, дзе ўжо даўно пануе белы тэрор, усе студэнцкія арганізацыі і сходы забаронены.

Цяпер студэнцтва больш ня грае галоўнай ролі ў рэвалюцыі; гэтая роля перайшла к рабочай клясе. Але і сёньня роля студэнцтва ў рэвалюцыі даволі значная і наагул мы павінны з пашанаю ўспамінаць рэвалюцыйную кітайскую моладзь, усё аддаваўшую для справы вызваленьня свайго народу.

Тао-Цын, Кітай. Сій Хсуэнь-яо.

# КАРЭСПАНДЭНЦЫІ

### Новыя заваяваньні.

Усьлед за Вільняй і ў Лідзе зроблены першы крок да заваяваньня места — 17.VII адбыліся выбары ў мястовую Раду і па сьпісу Беларусаў і тутэйшага працоўнага жыхарства прайшоў у Раду адзін беларус—Сябра Нагляднае Рады Лідзкае Акр. Упр. Т-ва Бел. Школы, Міхал Шымелевіч.

Ураз-жа па разьвязаньні старай Рады N. D. і Ch. D. распачалі энэргічную працу дзеля ўтварэньня адзінага хрысьціянскага фронту проціў жыдоў. Але гэты лёзунг здолеў адцягнуць ад працоўны толькі мэталёўцаў і на час прафэсыянальны саюз чыгуншчыкаў. Выбарны Камітэт беларусаў ад самага пачатку свайго істнаваньня вёў перагаворы з Радай прафэсыянальных саюзаў (у якую ўваходзілі і жыдоўскія саюзы) аб выстаўленьне супольнага сьпісу кандыдатаў. На мітынгу Z. Z. K. 29.VI прадстаўнік Віленскага Акр. Кам. Z. Z. K. урачыста выказаўся за адзіны фронт працоўных бяз розьніцы рэлігіі і нацыянальнасьці, што выклікала пратэсты і адыход з мітынгу часткі мэталёўцаў. Але праз гадзіну на канфэрэнцыі той-жа прадстаўнік Z. Z. K. пэпээсавец заявіў ужо зусім другое... аб двох сьпісах, польскім і жыдоўскім і зблёкаваньні іх і тлумачыў гэта з прызвычаенай толькі P.P.S. двулічнасьцю матывамі практычнага характару. Узбураныя жыдоўскія работнікі не згадзіліся на гэта, а таксама і на кампрамісную прапазыцыю — выставіць кандыдатамі хрысьціян і блёк працоўных застаў разьбіты, дзякуючы шовінізму польскіх сацыялістаў.

Утварыліся тры работніцкія сьпісы: беларускі, жыдоўскі і польскі. Апошні замест назвацца ўласным імем — P. P. S. прыбралі трохаршынны назоў, які падаю ніжэй. 3.VI беларусы наладзілі мітынг у мяйсцовым кіне, які прайшоў з вялікім пасьпехам. Дзеля таго, што польскія работнікі зблёкаваліся з сваей буржуазіяй, якую і самі ў ва ўсіх сваіх адозвах інакш і не называлі, як „Хіенай“, а жыдоўскія работнікі з сваей (праўда, гэтыя блёкі сьпісаў былі прызнаны няважнымі па фармальным прычынам) — беларусы змушаны былі выступіць самастойна. Польскія групы разьвілі страшную агітацыю і выдалі шмат грошай — было пушчана ўсё ў ход: нязьлічаныя плакаты, прывоз агітатараў пэпээсаўцаў з Вільні і Варшавы, агітацыйныя аўтамабілі і г. д... аж да магістрацкага апарату і амбон. Навет тоўсты ксёндз-дзекан ня гледзячы на ўпальную пагоду амаль цэлы дзень паўзаў па Слабодцы і раздаваў цукеркі. Апрача таго, знайшліся сярод нас здраднікі, польскія найміты і падлізьнікі, якія хацелі тайна ўтварыць выбарны Камітэт праваслаўных. Але іх брыдкая праца неспадзявана раскрылася, і на сабраньні спэцыяльна выбраных і запрошаных прадстаўнікаў зьявіўся няпрошаны прадстаўнік беларусаў, які выявіў усю тую наглую брахню і ілжу, якой яны — „ініцыятары“ карысталіся ў сваей агітацыйнай працы і, хоць сабраньне большасьцю 2-х галасоў пастанавіла ўтварыць гэты Камітэт, — ніхто з прысутных не згадзіўся ўвайсьці ў склад яго.

Пасьля такога „канфузу“ „ініцыятары“ ўсё-ж такі прадаўжалі сваю агідную працу, але ўжо без „Камітэту“. Яны не паўстыдаліся навет у дзень выбараў агітаваць за польскія групы, за нумар „свайго Пана“.

Самастойнае выступленьне беларусаў мае вялізарнае значэньне:

1) гэта — першая спроба ў больш шырокай меры, што паказала абуджэньне нацыянальнай сьвядомасьці ў тутэйшага жыхарства.

2) беларусы ўсё-ж такі маюць аднаго прадстаўніка ў Радзе (сабралі галасоў на $1\frac{1}{2}$ раднага.

3) выявіліся ўсе прадажныя і падлізьніцкія элементы нашага грамадзянства, якія аканчальна скампрамітаваліся ў вачох усіх грамадзян места Ліды

Рэзультаты выбараў наступныя:

№ 1. Дэмакратычныя хрысьціянскія мяшчане ўрадоўцы і ўмысловыя працаўнікі. (Група бурмістра Бэрмана), 3 мандаты.

№ 2. Прафэс. саюзы, працоўная інтэлігенцыя, дробныя дамаўласьнікі і неарганіз. работ. (P. P. S.), 3 манд.

№ 3. Блёк Хрысьц. (N.D. i Ch.D.) 6 манд.

№ 4. Беларусы і тутэйшае працоўнае жыхарства, 1 мандат.

№ 5. Земляробы і дамаўласьнікі — жыды. (Група заступніка бурмістра Вінцукага,) 1 мандат.

№ 6. Жыдоўскі нац. блёк, 9 манд.

№ 7, Жыдоўскі Работ. блёк, 1 манд.

Праежджы.

### Выбары ў валасную Раду.

(Лашанскай воласьці, Горадзенскага павету).

Доўга мы чакалі выбараў і нарэшце такі прычакаліся. Ведалі мы з газэтаў і з таго, што ў іншых валасьцёх адбываюцца выбары, што ўсюды маюць адбыцца выбары, а знача і ў нас. Аднаго вечара ні з таго ні з сяго прыяжджае да нас з воласьці солтыс і прывозіць запіску, зазываючую зьявіцца ў воласьць на выбары валасное Рады. Тут мы ўсе і ахнулі. Такі праўда дацягнулі на самы сенакос, як мы і спадзяваліся. А ў сенакос ведама, як сяляне ня хочуць адрывацца ад працы. Панкі, відаць, гэта добра ведалі і таму наўмысьля дацягнулі выбары да сенакосу. Але хапіла ў нас сьвядомасьці таго, што толькі ў нас саміх моц, дык адарваліся ад працы і пашлі на выбары. Аж аказалася, што сначатку трэба выбраць выбаршчыкаў з кожнай вёскі, якія і пойдуць у воласьць на выбары валасное Рады. Па вёсках выбары прайшлі вельмі спакойна, бо ведама — там мала ёсьць панскіх падлізьнікаў. Толькі ў аднэй вёсцы Нецечы, дзе знашоўся панскі падлізьнік Сьцяпан Мядзьведзь, ды яго памоцнік Данісевіч, было крыху блутаніны.

Гэтыя людцы страшна хацелі, каб хоць аднаго з іх выбралі на выбаршчыка, дык высоўвалі ўвесь час кандыдатуры адзін другога. Але ніхто іх не хацеў выбіраць. Тады яны пашлі жаліцца пану. Прыехаў войт з пісарам, зрабілі на-нава выбары, ды ўсёроўна прайшлі тыя самыя людзі, што і перш. А падлізьнікі так і засталіся з нічым.

З выбараў валасных усе былі вельмі здаволены. Беларусаў прайшло аж 9 чалавек і 3 палякі. Пры гэтым ня выбралі ніводнага асадніка.

Дык перамога на нашай старане! Пакрысе, па-крысе беларусы займаюць належнае ім месца.

Сын гора й нядолі.

### Выбары ў гмінную раду.

Белавеж, Бельшчына.

18 ліпня с. г. у нас адбыліся выбары ў гмінную раду. Фігуравала два сьпіскі: № 1 сялянскі беларускі і № 2 польскі, у які ўваходзілі выбарцы выключна толькі з Гайнаўскага раёну. Усе іх забегі і хлапоты, каб перамагчы сялянскі сьпісак, ня мелі блізу жадных уплываў. Мы правялі дванаццаць сваіх беларускіх кандыдатаў, а яны толькі трох. Чакаем і спадзяёмся, што новая гмінная рада хутка возьмецца за працу і ня пойдзе па сьлядох старое рады.

### Папраўка.

Пры выбарах у Ламшанскую гмінную Раду ўсіх радных выбрана ня 13 чалавек (9 беларусаў і 4 палякі), як падавала наша газэта ў папярэднім нумары, а 12, з якіх 9 беларусаў і 3 палякі.

# З Радавае Беларусі.

### Выдавецкая праца.

Адным з сваіх заданьняў, Інбелкульт паставіў шырокую і сыстэматычную працу па выданьню навуковых працаў у беларускай мове. Ужо надрукавана рад паважных працаў, шмат знаходзіцца ў друку, або гатуецца да друку.

Больш дэтальныя інфармацыі падамо ў наступным нумары.

### Выпуск маладых друкароў.

Адбыўся выпуск Менскай школы паліграфічнай прамысловасьці. Школу скончылі 20 маладых друкароў.

### Літоўскі аддзел пры інбелкульце.

Пры інбелкульце арганізуецца літоўскі аддзел. Мэта аддзелу — вывучаць гістарычнае мінулае Літвы.

Для кіраваньня аддзела запрашаецца вядомы літоўскі гісторык Матулайціс.

# ХРОНІКА.

**З Мястовай Рады м. Вільні.** Новавыбраны прэзыдэнт м. Вільні п. Фоліеўскі зьвярнуўся да міністра ўнутраных спраў з просьбай даць яму водпуск на тры гады па абавязку Камісара Ураду на м. Вільню, каб заняцца справамі на выбарнай пасадзе.

Новае паседжаньне Мястовай Рады, па некаторых даных, адбудзецца ў першай палове жніўня.

**Палітычныя нябожчыкі.** Уся прэса ў Польшчы, абгаварваючы справу апошняга „зьезду“ Ярэмічаўскага Сельсаюзу, адмячае поўны правал гэтае арганізацыі на мясцох. Для нас гэта было ясна ўжо даўно.

Пажадаем-жа паном генэралам вечнага пакою — і адпушчэньня грахоў, зробленых імі перад народам.

**Да спраў Бел. Нац. Камітэту.** Нядаўна старшыня сфальшаванага Нацкому, сэнатар Багдановіч, зьвярнуўся да запраўднага старшыні Бел. Нац. Камітэту гр. Савіцкага з прапазіцыяй склікаць нейкую нараду, на якую былі б запрошаны найбольш выдатныя культурныя і палітычныя дзеячы, з мэтаю зрабіць паразуменьне з групаю, якая сфальшавала Нацком. На гэтыя прапазіцыі старшыня Нацкому гр. Савіцкі адказаў, што пакуль істнуе сфальшаваны Камітэт, дык размовы наагул немагчымы аб якім-небудзь паразуменьні. Дзіўны чалавек гэты сэнатар! Здаецца і не малады чалавек, а робіць, як дзіця: прыймае ўчасьце ў няпрыгожых спосабах змаганьня з падаўляючай большасьцю нашых культурна-грамадзкіх установаў (гэтая большасьць якраз прадстаўлена ў праўным Нацкоме), а потым спадзяецца мець пасьпех у ролі прымірыцеля!

**З беларускага Выдавецкага Т-ва.** У свой час Т-вам быў абвешчаны месяц таннага продажу на некаторыя кніжкі. Ня гледзячы на тое, што гэты час ужо даўно прайшоў, шмат хто зьвяртаецца да кнігарні Т-ва аб высылцы кніжак па таннай цане. Таму паведамляецца, што цяпер продаж ідзе па звычайных цэнах.

Разам з тым паведамляецца, што на складзе Т-ва асталіся нераспраданымі каля сотні адрыўных календароў на 1927 год. Не жадаючы, каб навет гэтая сотка змарнавалася, а прынясла пэўную карысьць, — Т-ва рашыла распрадаць іх жадаючым па 50 грошай за штуку.

Перасылка, як звычайна, каштуе, згодна паштовым вымаганьням, г. ё. за меншую кніжку—каля 40 гр., большую—каля 50 гр.

**Выбары ў Лідзкі павятовы сэймік.** Як паведамляюць польскія газэты, у павятовы сэймік Лідзкага павету ўвайшлі — 3 беларусы, 8 жыдоў, 2 расейцаў і 11 палякоў.

Неяк дзіўна выглядае гэты сэймік, зложаны з прадстаўнікоў ад гмінных радаў, але ў кожным выпадку палякоў меншасьць.

**„Гурковы час“.** У зьвязку з летняй сьпёкай жыцьцё ўва ўсіх урадовых установах амаль замярло. Паны паразьяжджаліся па дворах і дачах на сьвежыя гуркі.

## Пісьмо у Рэдакцыю.

*Паважаная Грамадзянка Рэдактарка!*

Будзьце ласкавы дазвольце выказаць праз Вашу паважаную газэту выразы сэрдэчнай удзячнасьці ўсім тым палякам і беларусам, што яшчэ перад прыгаварам грамадзкага суда ў маей справе шляхам лістоўным і вусным ахвотна адзначылі сваё становішча поўнае жычлівасьці і сымпатыі ў зьвязку з маім выступленьнем у справе пасла Воевудзкага і абвешчаньнем у гэтай справе Маршалкоўскім судом матываў да прыгавору, якія характэрызавалі ў недапушчальна двузначны спосаб маей дзейнасьці.

Выказваю сапраўдную пашану
Станіслаў Сьвяневіч.



Рэдактар-Выдавец: М. Гічан.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.